8. Levy, A. F. Promoting democracy and denazification: American policymaking and German public opinion / A. F. Levy // Diplomacy and Statecraft. – 2015. – № 26. – P. 614–635.
9. Marshall, B. German attitudes to British military government 1945–47 [Electronic resource] / B. Marshall // Journal of Contemporary History. – 1980. – Vol. 15, № 4. – P. 655–684. – Mode of access: https://www.jstor.org/stable/260503. – Date of access: 29.01.2019.
10. Montgomery, J. D. Forced to be free: The artificial revolution in Germany and Japan / J. D. Montgomery. – Chicago : Chicago University, 1957. – 209 p.
11. Taylor, F. Exorcising Hitler: The occupation and denazification of Germany / F. Taylor. – L. : Bloomsbury, 2011. – 390 p.
12. Turner, I. Denazification in the British zone / I. Turner // Reconstruction in postwar Germany: British occupation policies and the Western zones, 1945–1955 / Ed. by I. Turner. – Oxford : Berg, 1989. – P. 239–267.

## ЗАМЕЖНЫЯ АРХІЎНЫЯ ФОНДЫ ПА ГІСТОРЫІ МІЖНАРОДНАГА ЧАРНОБЫЛЬСКАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА 1986–1991 гг.

К. А. Крывічаніна (Мінск)

Гісторыя міжнароднага чарнобыльскага супрацоўніцтва бярэ свой пачатак, калі не з першых пасляаварыйных дзён, то дакладна з першых пасляаварыйных тыдняў. Шырокавядома, што кіраўніцтва Савецкага Саюза і сам факт аварыі, і яе наступствы не спяшалася даводзіць да ведама як сваёй грамадскасці, так і замежнай супольнасці. Фіксацыя замежнымі, найперш скандынаўскімі, метэаралагічнымі і іншымі службамі павышаных узроўняў радыёактыўнасці, аналіз яе складу і магчымых шляхоў паходжання дазволілі прыйсці да высновы, што “сляды” надзвычай сур’ёзнай ядзернай аварыі вядуць у СССР.

Занепакоеныя замежныя ўрады пачалі звяртацца па каментары да МАГАТЭ (Міжнароднае агенцтва па атамнай энергіі), як міжнароднай аўтарытэтнай арганізацыі, курыруючай пытанні ядзернай бяспекі на глабальным узроўні. МАГАТЭ, у сваю чаргу, звярнулася па тлумачэнні да Савецкага Саюза. І ўжо 5 мая 1986 г. кіраўніцтва Міжнароднага атамнага агенцтва ў складзе Генеральнага дырэктара Х. Блікса, яго намесніка Л. Канстанцінава і кіраўніка дэпартамента ядзернай бяспекі М. Разэна ажыццяўляе свой першы чарнобыльскі візіт у Маскву [28]. Выкажам меркаванне, што менавіта з гэтага часу і бярэ свой пачатак міжнароднае чарнобыльскае супрацоўніцтва, якое ў першыя пасляаварыйныя гады вызначалася пераважным ўзаемадзеяннем па лініі СССР – МАГАТЭ.

На першапачатковым этапе беларускі ўдзел у міжнародным чарнобыльскім супрацоўніцтве быў больш, чым мінімальным, пра што сведчаць беларускія архівы. Толькі з 1989 г. у беларускіх дзяржаўных і ведамас-



Репозиторий ВГУ

ных архівах (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі, Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі, Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці, Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці і інш.) з'яўляюцца дакументальныя сведчанні ўключэння кіраўніцтва і грамадскіх супольнасцей БССР у міжнародны чарнобыльскі дыялог. Асобна ў корпусе беларускіх крыніц варта адзначыць шырокую дакументальную базу ведамаснага архіва Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь – спадкаемцы дакументальнай спадчыны МЗС БССР. На жаль, па незалежных ад аўтара прычынах, выявіць наяўнасць або адсутнасць дакументаў 1986–1989 гг. (за выключэннем асобных дакументаў за 1989 г.) не ўявілася магчымым. Па-першае, гэта звязана са спецыфікай працы архіўнай службы ведамства, што з пэўнага часу закрыла непасрэдны доступ да вопісаў фондаў знешнім даследчыкам, а па-другое, правяла адбор і прадаставіла да вывучэння матэрыялы толькі з 1990 г. уключна. Таму выкарыстанне крыніцавай базы архіваў Расійскай Федэрацыі (як спадкаеміцы дакументальнай спадчыны СССР) і міжнародных арганізацый, у прыватнасці МАГАТЭ, разглядаем свайго кшталту непазбежнай умовай адэкватнага навуковага даследавання пытання міжнароднага чарнобыльскага супрацоўніцтва ўцэлым, і ўдзелу ў ім Беларусі ў прыватнасці.

Фонды расійскіх архіваў прадстаўляюць дакументальную спадчыну вышэйшых органаў дзяржаўнай улады і кіравання Савецкага Саюза, у кампетэнцыю якіх уваходзілі фукцыі фармуліравання і рэалізацыі канцэптуальных палажэнняў знешняй палітыкі СССР, вызначэння асноўных кропак судакранання для міжнароднага супрацоўніцтва па тых ці іншых напрамках, ажыццяўлення практычных мерапрыемстваў узаемадзення.

Асобнае месца ў справе вывучэння праблем міжнароднага чарнобыльскага супрацоўніцтва займаюць дакументы Архіва знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі пры Міністэрстве замежных спраў (МЗС) Расійскай Федэрацыі. Спецыфіка працы з фондамі архіва расійскага знешнепалітычнага ведамства (спадкаемцы МЗС СССР) абумоўлена тым фактарам, што даследчык не працуе самастойна з вопісамі дакументаў, не мае магчымасці ўласна праводзіць вышук і адбор патэнцыйна інфарматыўных спраў сярод наяўнага корпусу крыніц. Такую працу за яго выконваюць супрацоўнікі ведамаснай архіўнай установы. Гэта, на наш погляд, можа звузіць кола крыніц, прадастаўленых да прагляду даследчыку, як па прычыне аб'ектыўнай некампетэнтнасці адказнага за адбор дакументаў супрацоўніка ў вузкай даследчыцкай тэме, так і механічнага адбору спраў па ключавых словах (слове) заяўленага даследавання. Як вынік, глыбіня прапрацоўкі і вывучэння корпусу наяўных першакрыніц можа быць недастатковай. Непасрэдна сам даследчык не ведае, якія дакументы засталіся па-за яго ўвагай і ці маюцца такія ўвогуле.

Сярод прадастаўленых да працы спраў Архіва знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі – матэрыялы Пастаяннага Прадстаўніцтва СССР пры



Репозиторий ВГУ

міжнародных арганізацыях у Вене (фонд 635), якое, між іншага, было пасярэднікам у кантактах СССР з МАГАТЭ. Асноўны масіў дакументаў складаюць матэрыялы рознаскіраванага перапіставання: 1) паміж прадстаўніцтвам СССР у Вене, саюзных міністэрстваў і ведамстваў (Дзяржаўны камітэт па выкарыстанні атамнай энергіі (ДКАЭ), Дзяржгідрамет, Нацыянальная камісія па радыяцыйнай ахове (НКРА), Міністэрства аховы здароўя (МАЗ), Акадэмія медыцынскіх навук (АМН)) і МАГАТЭ (Сакратарыят і Дэпартамент ядзернай бяспекі); 2) першага Каардынатара ААН па Чарнобылю М. Дж. Энсці з прадстаўніцтвам СССР у Вене і першым наместнікам Прэм'ер-міністра СССР В. Дагужыевым. Больш "сціплы" блок дакументаў складаюць інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы, падрыхтаваныя савецкімі супрацоўнікамі МАГАТЭ і супрацоўнікамі прадстаўніцтва адносна спецыяльных мерапрыемстваў арганізацый сістэмы ААН, прысвечаных праблемам Чарнобыльскай аварыі і яе наступстваў. Асобныя дакументы – справаздачы, даведкі, разліковыя лісты, копіі публікацый у замежных газетах і часопісах [1; 2; 3; 4; 5; 6]. Прадастаўленыя справы маюць грыф "НЕСАКРЭТНА". Выкажам меркаванне, што значная доля архіўных матэрыялаў былога знешнепалітычнага ведамства СССР пакуль не даступна даследчыкам пад грыфамі "ДСП", "САКРЭТНА" і "ЦАЛКАМ САКРЭТНА".

Важная роля ў рэалізацыі ліквідацыйных мерапрыемстваў, выпрацоўкі нарматываў жыцця і працы на забруджаных тэрыторыях, вывучэнні і выпрацоўцы ацэнак уплыву наступстваў Чарнобыльскай аварыі на здароўе чалавека належыла Міністэрству аховы здароўя СССР і шчыльна звязаным з яго дзейнасцю арганізацыям і навукова-даследчым інстытутам. Таму надзвычай важнымі для даследавання ўяўляюцца дакументы фонда Міністэрства аховы здароўя СССР (Р8009), што захоўваецца Дзяржаўным архівам Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Ва ўмовах, калі для міжнародных навукова-тэхнічных сувязей была характэрна высокая цэнтралізацыя, і асноўныя кантакты з замежнымі навуковымі цэнтрамі і арганізацыямі ажыццяўляліся Масквой і яе інстытутамі, справаздачы аб замежных камандзіроўках і прыёме замежных дэлегацый часам з'ўляюцца адзінай крыніцай інфармацыі па міжнародных чарнобыльскіх кантактах у 1986–1991 гг., з якіх выпадалі, напрыклад, беларускія вучоныя. Акрамя таго, справы фонда Р8009 утрымліваюць матэрыялы ўнутранага і міжведамаснага перапіставання Міністэрства аховы здароўя СССР з НКРА, АМН СССР, Інстытутам біяфізікі МАЗ СССР, ДКАЭ, Дзяржгідраметам СССР, Вярхоўным Саветам і Саветам Міністраў СССР, перапіставання з МАГАТЭ і іншымі саюзнымі і міжнароднымі арганізацыямі адносна магчымых медыцынскіх наступстваў Чарнобыльскай аварыі для насельніцтва СССР і Еўропы; закранаюць гісторыю правядзення міжнароднай экспертызы распрацаванай у СССР канцэпцыі бяспечнага пражывання насельніцтва на забруджаных тэрыторыях і інш. [9;

10; 11; 12; 13; 14; 15; 16; 17; 18; 19; 20; 21; 22; 23]. Шэраг матэрыялаў выяўлены ў фондзе Савета Міністраў СССР (Р5446): рашэнні Урадавай камісіі па ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС, у тым ліку па супрацоўніцтву з МАГАТЭ; матэрыялы па падрыхтоўцы Пагаднення аб правядзенні міжнародных даследаванняў насутпстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС на базе НВА “Прыпяць” і інш. [7; 8]. Асобныя дакументы па праблемах міжнароднага чарнобыльскага супрацоўніцтва выяўлены ў персанальных фондах ДАРФ: вядомага дзяржаўнага дзеяча СССР А. М. Якаўлева (фонд 10063), гісторыка-архівіста А. П. Елпацьеўскага (фонд 10089) [24; 25].

Другі блок замежных крыніц па тэме даследавання складаюць архіўныя фонды арганізацый сістэмы ААН, што прынялі актыўны ўдзел у вывучэнні і ацэнцы наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, падтрымалі праекты міжнароднай дапамогі пацярпелым. Багатую дакументальную спадчыну ўтрымліваюць фонды Архіва МАГАТЭ, размешчанага ў штаб-кватэры ААН у г. Вена (Венскі міжнародны цэнтр, Аўстрыя), дзе месціцца непасрэдна і штаб-кватэра агенцтва. Дакументы дадзенай міжнароднай арганізацыі, у прыватнасці справы Савета Упраўляючых і Офіса Генеральнага дырэктара МАГАТЭ, дазваляюць паглядзець на праблему вачыма міжнароднай арганізацыі, агенда якой з 1986 г. была шчыльна звязана з Чарнобыльскай аварыяй. Прычым інтарэс МАГАТЭ тычыўся не толькі пытанняў ядзернай баспекі, але і ацэнак наступстваў аварыі для навакольнага асяроддзя, і здароўя чалавека.

Сярод дакументаў, выяўленных у архіве МАГАТЭ, інтарэс найперш прадстаўляюць наступныя: запісы пасяджэнняў Савета Ўпраўляючых і матэрыялы да іх, дзе разглядаліся чарнобыльскія пытанні; нарады экспертаў МАГАТЭ і іншых міжнародных арганізацый з удзелам прадстаўнікоў СССР і зацікаўленых краін-удзельніц; пераліставанне Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (ФАО) і МАГАТЭ ў межах сумеснага дэпартамента адносна наступстваў Чарнобыльскай аварыі ў галіне сельскай гаспадаркі і харчавання; гадавыя справаздачы і бюджэты агенцтва; справаздачы аб выніках камандзіровак міжнародных экспертаў у СССР для азнаямлення з наступствамі Чарнобыльскай аварыі і г.д. [26; 27; 28; 29; 30; 31; 32; 33; 34; 35; 36; 37; 38].

Адзначым, што інфармацыйны патэнцыял вышэйпералічаных замежных фондаў патрабуе далейшага вывучэння і навуковага асэнсавання.

На наш погляд, даследаванне беларускіх і замежных архіўных крыніц павінна адбывацца раўналежна, з улікам той вядучай ролі, якую ў міжнародным чарнобыльскім ўзаемадзеянні 1986–1991 гг. адыгрывалі саюзныя органы ўлады і кіравання і міжнародныя арганізацыі, у першую чаргу МАГАТЭ. Менавіта гістарычны адрэзак часу 1986–1991 гг. пакінуў пасля сябе “след” канкрэтных гістарычных асобаў, фактаў і фактараў, засведчанных на старонках архіўных дакументаў, што дазваляюць зразумець

Репозиторий ВГУ

вытокі міжнароднага чарнобыльскага супрацоўніцтва, разгарнуўшагася ў 1990-я гг., выявіць яго тэндэнцыі і заканамернасці.

1. Архіў знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі (АЗПРФ). – Ф. 635. Воп. 30. П. 157. Спр. 32.
2. АЗПРФ. – Ф. 635. Воп. 31. П. 170. Спр. 28.
3. АЗПРФ. – Ф. 635. Воп. 32. П. 183. Спр. 28.
4. АЗПРФ. – Ф. 635. Воп. 34. П. 197. Спр. 9.
5. АЗПРФ. – Ф. 635. Воп. 35. П. 199. Спр. 6.
6. АЗПРФ. – Ф. 635. Воп. 35. П. 200. Спр. 11.
7. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). – Ф. Р5446. Воп. 150. Спр. 1617.
8. ДАРФ. – Ф. Р5446. Воп. 162. Спр. 2262.
9. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 2179.
10. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 2295.
11. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 2614.
12. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 2645.
13. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 2658.
14. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 2662.
15. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 2664.
16. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 4012.
17. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 4013.
18. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 4014.
19. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 4337.
20. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 4338.
21. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 4486.
22. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 4880.
23. ДАРФ. – Ф. Р8009. Воп. 51. Спр. 5326.
24. ДАРФ. – Ф. 10063. Воп. 1. Спр. 382.
25. ДАРФ. – Ф. 10089. Воп. 1. Спр. 145.
26. The IAEA Archive. Division of Conference and Document Services. Office of the Director General (DCDS/ODG). – Box 03682.
27. The IAEA Archive. (DCDS/ODG). – Box 03706.
28. IAEA Archive. Division of Conference and Document Services. Board of Governors (DCDS/BOG). – Box 15717.
29. IAEA Archive. DCDS/BOG. – Box 15718.
30. The IAEA Archive. DCDS/BOG. – Box 33006.
31. The IAEA Archive. DCDS/BOG. – Box 33007.
32. The IAEA Archive. DCDS/BOG. – Box 33043.
33. The IAEA Archive. DCDS/BOG. – Box 33045.
34. The IAEA Archive. DCDS/BOG. – Box 33046.
35. The IAEA Archive. DCDS/BOG. – Box 33047.
36. The IAEA Archive. DCDS/BOG. – Box 33048.
37. The IAEA Archive. DCDS/BOG. – Box 33049.

Репозиторий ВГУ